**Литература**

1 Игнатенко, М. В. Становление жанра «врачебной прозы» / М. В. Игнатенко // Лучшая научная статья 2016: сборник статей IV Международного научно-практического конкурса. – Пенза : МЦНС «Наука и Просвещение», 2016. – С. 287–290.

2 Игнатенко, М. В. Классификация произведений жанра «врачебной прозы» / М. В. Игнатенко // World Science: problems and innovation: сб. статей VII Международной научно-практической конференции / под ред. Г. Ю. Гуляева. – Пенза : МЦНС «Наука и Просвещение», 2017. – С. 178–181.

3 Покровский, В. И. Популярная медицинская энциклопедия / В. И. Покровский. – М. : Оникс, Альянс-В, 1998. – 688 с.

4 Вольф, Ю. Школа литературного мастерства: от концепции до публикации: рассказы, романы, статьи, нон-фикшн, сценарии, новые медиа / Ю. Вольф. – М. : Альпина нон-фикшн, 2014. – 384 с.

5 Углов, Ф. Г. Сердце хирурга / Ф. Г. Углов. – М. : АСТ, 2014. – 512 с.

6 Правдин, Д. А. Хирург возвращается / Д. А. Правдин. – М. : АСТ, 2014. – 320 с.

7 Правдин, Д. А. Записки городского хирурга / Д. А. Правдин. – М. : АСТ, 2013. – 352 с.

8 Марш, Г. Не навреди. Истории о жизни, смерти и нейрохирургии / Г. Марш. – М. : Издательство «Э», 2016. – 320 с.

9 Амосов, Н. М. Мысли и сердце / Н. М. Амосов. – Донецк: Сталкер, 1998. – URL: http://royallib.com/book/amosov_nikolay/misli_i_serdtse.html. – Дата доступа: 11.04.2017.

10 Ракитина, С. В. Заглавие как основной текстовый концепт (на материале книг Н. М. Амосова «Мысли и сердце» и Ф. Г. Углова «Сердце хирурга») / С. В. Ракитина, Н. Ф. Ефремова // Вестник ИГЛУ. – 2014. – № 2 (27). – С. 48–53.

**УДК 94:323:26:631.115.6(476.2)"192/193"**

***І. У. Ігнаценка***

## “ВЫ РАСКУЛАЧВАЕЦЕ, А МЫ НЕ ПОЙДЗЕМ І ПАМАГАЦЬ”: СЯЛЯНСКІ СУПРАЦІЎ ПАЛІТЫЦЫ СУЦЭЛЬНАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ

*Артыкул прысвечаны супраціўленню сялян Гомельшчыны палітыцы раскулачвання і высялення заможных гаспадарак. Правядзенне палітыкі суцэльнай калектывізацыі суправаджалася прымусовымі мерамі і адміністратыўным націскам на сялян. Вынікам гэтага стаў актыўны ўсплеск масавых сялянскіх выступленняў. Калі да 1929 года непасрэднай прычынай іх узнікнення з’яўляліся адміністратыўна-рэпрэсіўныя меры ўздзеяння на сялян, то ў 1930 годзе сялянскія хваляванні адбываліся на глебе гвалтоўнай калектывізацыі і раскулачвання. У дадзеным артыкуле разгледжаны прычыны і метады супраціўлення сялян раскулачванню.*

Курс на рэзкае фарсіраванне тэмпаў калектывізацыі быў прыняты пасля лістападаўскага Пленума ЦК ВКП(б) 1929 года. Нягледзячы на цяжкасці і недахопы калгаснага будаўніцтва (нізкі ўзровень тэхнічнай базы калгасаў, недастатковая арганізаванасць і нізкая прадуктыўнасць працы, востры недахоп кадраў і адсутнасць неабходных спецыялістаў і г.д.), Пленум прыняў рашэнне аб пераходзе цэлых раёнаў СССР да суцэльнай калектывізацыі. Па ініцыятыве І. В. Сталіна быў узяты курс на “вялікі пералом”. Кіраўніцтва ВКП(б) лічыла, што гэты шлях дасць магчымасць вырашыць праблему з нарыхтоўкай зерня ў краіне, і рэалізаваць ідэю “перакачкі” сродкаў з аграрнага сектара ў прамысловы [1, с. 23].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пагоня за высокімі тэмпамі калектывізацыі суправаджалася прымусовымі мерамі, адміністратыўным націскам на сялян: вялікія нормы сельгаспадатку, націск пры зборы падаткаў, кантроль за ходам хлебанарыхтовак, самаабкладанне, а таксама "нажим на кулаков, злостно задерживающих и не сдающих своих излишков государству" [2, арк. 59].

30 студзеня 1930 года выйшла пастанова ЦК ВКП(б) "О мероприятиях по ликвидации кулацких хозяйств в районах сплошной коллективизации". Згодна з ёй заможныя гаспадаркі былі падзелены на тры катэгорыі. Гаспадары "кулацкіх" сямей першай катэгорыі (удзельнікі "контррэвалюцыйнай барацьбы") падвяргаліся арышту, і справы аб іх дзейнасці перадаваліся для разгляду спецтроек у складзе прадстаўнікоў АДПУ, абкамаў ВКП(б) і пракуратуры. "Кулакі", аднесеныя да трэцяй катэгорыі (лаяльныя да савецкай улады), як правіла, не адпраўляліся на спецпасяленне. Раскулачаныя сяляне другой катэгорыі (выкарыстоўвалі наёмную рабочую сілу), а таксама сем'і "кулакоў" першай катэгорыі высяляліся ў аддаленыя раёны краіны на спецпасяленне (інакш гэта называлася "кулацкай ссылкай" [3, с. 5].

1 лютага 1930 года ЦВК і СНК СССР прынялі пастанову "О мероприятиях по укреплению социалистического переустройства сельского хозяйства в районах сплошной коллективизации и по борьбе с кулачеством". Пастанова пазбаўляла сялян права арэнды і найму рабочай сілы, у дачыненні да іх дазвалялася выкарыстоўваць рэпрэсіўныя меры: канфіскацыю маёмасці, высяленне ў "аддаленыя мясцовасці" СССР [4].

Спецслужбы БССР мелі план высылкі, кантралявалі яго выкананне. Напрыклад, згодна з планам летам 1931 года з Гомельшчыны (пад Гомельшчынай неабходна разумець тэрыторыю Гомельскай акругі з 1926 па 1930 гг. (Брагінскі, Буда-Кашалёўскі, Веткаўскі, Гомельскі, Добрушскі, Камарынскі, Лоеўскі, Рэчыцкі, Уваравіцкі, Хойніцкі, Церахоўскі, Чачэрскі раёны БССР) планавалася выслаць 484 сям'і колькасцю 1939 чалавек. Сем'і "кулакоў" трэба было даставіць на адпаведныя чыгуначныя станцыі (Рэчыца – 253 сям'і агульнай колькасцю 1013 чалавек і Гомель – 231 сям'я агульнай колькасцю 926 чалавек), дзе іх чакалі цягнікі, для перасялення ў аддаленыя раёны СССР [5, арк. 79]. З БССР у Паўночны край (Архангельская і Валагодская губерні) і Урал было выслана з 1930 па 1931 гады 15 724 сям'і (73 415 чалавек), з іх 11 079 сямей (52 914 чалавек) – у 1930 годзе і 4645 сямей (20 501 чалавек) – у 1931 годзе [6]. Увогуле па СССР за 1930–1937 гг. было выслана 2 464 250 сялян [7].

Наступленне савецкай улады на сялянства, асабліва на яго заможную частку, суправаджалася ростам незадаволенасці сялянства. У 1930 годзе адбываецца магутны ўсплеск масавых сялянскіх выступленняў: на тэрыторыі СССР адбылося 13 756 выступленняў або ў 10,5 разоў больш, чым у 1929 годзе, з іх 508 у БССР [7]. Калі ў папярэднія гады непасрэднай прычынай іх узнікнення з'явіліся адміністратыўна-рэпрэсіўныя меры ўздзеяння на сялян, то ў 1930 годзе сялянскія хваляванні адбываліся галоўным чынам на глебе гвалтоўнай калектывізацыі і раскулачвання.

Не стала выключэннем і Гомельшчына. У палітычнай характарыстыцы Гомельскага раёна і акругі за 1930 год адзначалася: "Общее настроение характеризуется именно отрицательным отношением крестьянства к проводимым мероприятиям на селе, а именно: хлебозаготовкам, заготовке картофеля, контрактации и колхозному строительству. <…> Настроение это стало наблюдаться особенно после ликвидации кулачества" [8, арк. 10–10 ад.] Асноўнымі абаронцамі "кулакоў" выступалі беднота і чырвоныя партызаны, якія па меркаванні савецкага кіраўніцтва, з'яўляліся апорай улады ў вёсцы. Былі выпадкі, калі на абарону заможных сялян станавілася ўся вёска. Так, жыхары вёскі Новыя Дзятлавічы прымусілі сысці з двара заможных сялян старшыню сельскага Савета, які прыйшоў, каб праверыць дакументы ў заможнай сям'і. Мелі месца і масавыя хадатайствы за вяртанне высланых заможных сямей, а таксама спачуванне апошнім [8, арк. 10–10 ад.]. Калі праязджаў абоз з высяляемымі сялянамі праз населены пункт Насовічы Гомельскага раёна, то з боку сялян (серадмякоў) чуліся

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

такія выказванні: "это им ("савецкай уладзе" – І. І.) обольётся кровью, даром не пройдет" [9, арк. 31]. Цікава, што паўсюдна аднавяскоўцы патрабавалі вынесці пытанне аб высяленні на агульнае галасаванне (в. Гадзічава Церахоўскага раёна, в. Отар і в. Дудзічы Чачэрскага раёна і г.д.), пры гэтым, пад час галасавання, можна было пачуць выкрыкі ў адрас савецкай улады "Вы сейчас выселяете кулаков, а потом станете выселять и бедняков", "Пущай гонят (савецкая улада – І. І.), придет время, что мы у колхозников будем резать мясо". У некаторых выпадках сяляне адмаўляліся супрацоўнічаць з мясцовымі органамі ўлады. Так, у в. Бацунь Уваравіцкага раёна сабраліся сяляне (каля 45 чалавек), якія адмовіліся везці высяляемых да пункту збору, патрабуючы адмяніць высяленне. Пры гэтым сяляне былі настроены катэгарычна (збіраліся дэлігіраваць сваіх прадстаўнікоў у РВК і нават гатовы былі да высялення ўсёй вёскі) [10, арк. 15–21].

Для абароны заможных сялянскіх сямей аднавяскоўцы выкарыстоўвалі і сілавыя сродкі. Так, у вёсцы Чабатовічы Уваравіцкага раёна 16 сакавіка 1930 года каля дома заможнага селяніна, якога збіраліся высылаць, сабралася ўся радня і падняла крык, заявіўшы аператыўнай групе, што "только мертвыми из дома повезете, но живыми не сдадимся". Калі аператыўная група з'явілася яшчэ раз для праверкі падрыхтоўкі да высялення, сабралася каля 100 узброеных накамі сялян, якія выкрыквалі "Кто издал закон о выселении!". У выніку падрыхтоўка да высялення была прыпынена [10, арк. 15–21].

Савецкая ўлада тлумачыла такія паводзіны бяднейшай часткі сялянства неадукаванасцю і напалоханасцю з боку "кулакоў". Ці было гэта на сам рэч? Ці з'яўляліся "кулакі" сапраўднымі тэрарыстычнымі элементамі, або былі ахвярамі палітычнага рэжыму? І чаму аднавяскоўцы выступалі ў падтрымку высяляемых? Адказ на гэтыя пытанні даюць архіўныя матэрыялы. У пратаколе пазачарговага паседжання прэзідыума Гомельскага райвыканкама ад 2, 3 і 7 сакавіка 1930 года, разглядаюцца анкеты "кулацкіх" гаспадарак вызначаных да высялення. Да "кулацкіх" аднесены наступныя гаспадаркі: у в. Рудня Марымонава – Рудакоў Аляксандр (сям'я складаецца з 5 чалавек). Да рэвалюцыі дадзеная гаспадарка мела 65 дзесяцін зямлі, 6 галоў рабочай жывёлы, а ў 1930 годзе – 12,5 дзесяцін зямлі (прыкладна 12,5 га), 3 галавы рабочай жывёлы. Або хутар Казлова – Казлоў Фёдар (сям'я складаецца з 11 чалавек). Да рэвалюцыі дадзеная гаспадарка мела 35 дзесяцін зямлі, а ў 1930 годзе – 19 дзесяцін; вёска Касцюкоўка – Захарэвіч Барыс (сям'я складаецца з 6 чалавек). Да рэвалюцыі дадзеная гаспадарка мела 34 дзесяціны зямлі, а ў 1930 годзе – 10 дзесяцін і г.д. [11, арк. 1 ад., 3, 4 ад.]. Яскравую карціну, так званай, "кулацкай" гаспадаркі, даюць успаміны сведкаў тых падзей. Напрыклад, Балоткіна Юлія Трафімаўна, жыхарка вёскі Ліцвінавічы Кармянскага раёна, успамінае аб гаспадарцы свайго дзеда Ігнаценкі Мірона Ігнатавіча: "Хазяйства дужа бальшоя было: авечак тады держалі, свінней, коней, пахалі зямлю. Ну і каровы, і ўсё – якоя там хазяйства?! Ну работаў! Дзед беспашчадна работаў, сваё поля пахаў і харашо жыў" [12] Або успаміны жыхаркі таго ж населенага пункта Палаўковай Фені Пятроўны: "мой дзед Палаўкоў Ульян быў багаты па тых мерках, ён паром дзержаў, сад у яго быў, бальшая пасека ..."[13]. Як бачым, заможныя сяляне мелі шмат зямлі, якую апрацоўвалі, атрымлівалі з гэтага прыбытак. Гэта былі сапраўдныя гаспадары – людзі, якія ўмелі добра працаваць. Аднак гэта не адпавядала планам партыйнага кіраўніцтва і супярэчыла галоўнай лініі партыі па дасягненні сацыяльнай і эканамічнай роўнасці.

Аб добрых адносінах сялян да заможных гаспадарак сведчаць наступныя факты. У вёсках Усохская Буда, Уць, Чарцянка, Васільеўка, Глубоцкае Церахоўскага раёна пры правядзенні агульных сходаў беднаты можна было пачуць такія выказванні: "Вы раскулачваеце, а мы не пойдзем і памагаць", "У нас нет кулаков, некого выселять", "У нас нет кулаков, некого выселять, а если они и есть, то от них мы получаем пользу, весной они нам дают бульбу, муку и другие продукты за отработку", "Не дадим выслать семью Ворганова Осипа, ибо он хороший хозяин и помогал бедноте, мы выселяем хороших людей" [10, арк. 15–21]. Такія адносіны сялян выкліканы тым, што



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

заможныя гаспадары дапамагалі больш слабым гаспадаркам (у эканамічным плане) пры неўраджаі, нейкіх стыхійных бедствах: пазычалі грошы, прадукты харчавання. За гэта бедныя гаспадаркі павінны былі адпрацаваць свой доўг. Заможныя сяляне валодалі аўтарытэтам сярод аднавяскоўцаў. Акрамя таго, большая частка сялян была аб’яднана роднаснай сувяззю і не бачыла ў асобах заможных сялян ворагаў.

З другой паловы 1930 года колькасць сялянскіх выступленняў скарацілася. Звязана гэта было з часовым прыпыненнем раскулачвання, фактычна спынілася і калектывізацыя. З восені 1930 года пачалася арганізацыя “новага прыліву” ў калгасы, узмацніўся падатковы гнёт, што выклікала незадаволенасць сялян. Аднак масавых хваляванняў, падобна вясновым, ужо не было.

## Літаратура


1 Врублевский, А.П. Из истории репрессий против белорусского крестьянства, 1929–1934 гг. / А. П. Врублевский, Т. С. Протько, под ред. М. П. Костюка. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 144 с.

2 Всем секретарям райкомов “О ходе хлебозаготовок” // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Гомельскай вобласці (далей ДАГАГВ). – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 555. – Арк. 59.

3 Земсков, В. Н. “Кулацкая ссылка” в 30-е гг. / В. Н. Земсков // Социологические исследования. – 1991. – № 10. – С. 3–21.

4 Постановление ЦИК и СНК СССР от 1 февраля 1930 года “О мероприятиях по укреплению социалистического переустройства сельского хозяйства в районах сплошной коллективизации и по борьбе с кулачеством” [Электронны рэсурс] / Историко-генеалогический словарь-справочник. Постановления партии и правительства 1926–1964 гг. – URL: http: // www.defree.ru/publications/p01/p40.htm. (дата звароту: 17.12.2012).

5 Землеустройство в Гомельской губернии по материалам обследования комиссий выделенных Гомельским губисполкомом в 1925 году // ДАГАГВ. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 147. – Арк. 28.

6 Ивницкий, Н. А. Репрессивная политика советской власти в деревне (1928–1933 гг.) / Н. А. Ивницкий. – РАН. Институт российской истории, Университет г. Торонто (Канада). – М., 2000. – 350 с.

7 Ивницкий, Н. А. “Великий перелом”: трагедия крестьянства. Коллективизация и раскулачивание в начале 30-х годов. По материалам Политбюро ЦК ВКП(б) и ОГПУ / Н. А. Ивницкий // Судьбы российского крестьянства: сб. науч. ст. – М. : Российск. гос. гуманит. ун-т. – 1995. – С. 249–297.

8 Политическая характеристика Гомельского района и округа (1930 г.) // ДАГАГВ. – Ф. 205. – Воп. 1а. – Спр. 45. – Арк. 10–10 ад.

9 Спецсводка № 36 Гомельского ОГПУ “Политнастроение города и деревни в связи с выселением кулачества” по состоянию на 19 марта 1930 года // ДАГАГВ. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 714. – Арк. 30–34.

10 Спецсводка № 34 Гомельского ОГПУ “Ход подготовки к выселению кулачества и политнастроение деревни в связи с этим” // ДАГАГВ. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 714. – Арк. 15–21.

11 Протокол внеочередного заседания Президиума Гомельского Райисплкома от 2, 3 и 7 марта 1930 г. // ДАГАГВ. – Ф. 205. – Воп. 1а. – Спр. 49. – Арк. 1–4 ад.

12 Успаміны Балоткінай Ю. Т. (1936 г.н.), жыхаркі вёскі Ліцвінавічы Кармянскага раёна, аб правядзенні калектывізацыі ў 1930-х гг. у вёсцы Ліцвінавічы Кармянскага раёна (па звестках яе маці).

13 Успаміны Палаўкова В. М. (1928 г.н.) і Палаўковай Ф. П. (1934 г.н.), жыхароў вёскі Ліцвінавічы Кармянскага раёна, аб правядзенні калектывізацыі ў 1930-х гг. у вёсцы Ліцвінавічы Кармянскага раёна.




РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ